члены Савета па ўзаемадзеянні падчас візітаў на прадпрыемствы:

— Савет па ўзаемадзеянні ахоплівае прадстаўнікоў усіх катэгорый кіравання і гаспадарчых суб'ектаў — таму, па-першае, ёсць нагода абмяняцца думкамі, па-другое, калі прафесіяналы сустракаюцца, яны ўзаемна ўзбагачаюць адзін аднаго. Тут таксама прымаюць удзел прадстаўнікі прафсаюзаў, Акадэміі кіравання... Я думаю, што і для гэтых арганізацый наша мерапрыемства будзе добрай школай. У Лідскім раёне досыць паспяхова вырашаюцца сацыяльныя пытанні, таму сёння мы разглядалі работу і дзіцячых дашкольных устаноў, і аб'ектаў аховы здароўя, і школ ... Можа, не так глыбока, як вытворчую сферу і работу Саветаў, але гэтыя пытанні таксама былі ў полі зроку. Такім чынам, можна казаць пра комплексны падыход. Ёсць чаму вучыцца, што запазычыць і трансфармаваць на ўсю тэрыторыю.

## Вырашаць разам

Вынікі ўбачанага ў раёне прадстаўнікі Савета па ўзаемадзеянні абмеркавалі на пасяджэнні. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандр Папкоў адзначыў, што «гэта тое кола зносін, калі мы можам высветліць пэўныя пытанні, праблемы, якія ўзнікаюць у нашым паўсядзённым жыцці».

На пасяджэнні выступілі і прадстаўнікі кіраўніцтва Лідскага раёна і Гродзенскай вобласці. Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар Жук адзначыў, што ў вобласці стала добрай практыкай сумесна планаваць і праводзіць розныя мерапрыемствы — прэзідыумы абласнога Савета і выканкама, пасяджэнні прэзідыума, пастаянных і міжведамасных камісій, якія створаны пры абласным выканаўчым камітэце. «Старшыня Гродзенскага аблвыканкама заўсёды ўдзельнічае ў сесіях, кантактуе з дэпутатамі, — і мы тут цесна супрацоўнічаем. Сумесна распрацоўваем і зацвярджаем дакументы, якія ўплываюць на сацыяльна-эканамічнае жыццё. Каля 30% дэпутатаў абласнога Савета ўключаны ў склад міжведамасных камітэтаў і камісій». Дарэчы, пры абласным Савеце ў 2015 годзе былі створаны маладзёжны парламент.

Гродзенская вобласць як прыгранічная актыўна ўдзельнічае ў трансгранічных праграмах супрацоўніцтва. Дзве найбуйнейшыя: Латвія—Літва—Беларусь і Польшча—Беларусь—Украіна. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў расказаў, што «цяпер падрыхтаваны 200 праектаў па гэтых дзвюх праграмах на суму больш за 50 млн еўра. З 2017 года пачнём працаваць над імі». Вядома, першапачатковa яны пройдуць пэўны адбор, і толькі лепшыя ідэі будуць рэалізаваны. Старшыня Лідскага райвыканкама Міхаіл Карповіч звярнуў увагу на тое, што летась дзякуючы экспарту тавараў у раён паступіла каля $270 млн — на душу насельніцтва прыпадае каля $2000 экспартнай выручкі. А гэта другое месца ў вобласці.

## Ведаць адзін аднаго

Нацыянальная акадэмія навук правяла сацыялагічнае даследаванне і высветліла, ці ведаюць выбаршчыкі сваіх дэпутатаў. Лічбы не радуюць. На пярвічным узроўні сваіх дэпутатаў ведаюць 53% грамадзян, на ўзроўні раёна — 41%, вобласці — 20%, членаў Палаты прадстаўнікоў — 15%, Савета Рэспублікі — 12%. Міхаіл Мясніковіч параіў «сустракацца з людзьмі, вырашаць пытанні, а лепш не дапускаць ніякіх праблем, працаваць на апярэджанне».

Адно з галоўных дасягненняў Лідчыны, якое адзначылі ўсе ўдзельнікі выязнога пасяджэння, — прыцягненне інвестыцый. Наконт гэтага выказаўся і старшыня Савета Рэспублікі:

«Давайце паглядзім на міжнародныя трэнды. Ужо другі год запар ідзе вялікі адток капіталу з краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Па розных ацэнках, ад $500 млрд у год вяртаецца ў краіны ЕС і ЗША. Працэс набірае абароты. Толькі за 11 дзён студзеня 2017 года фонды, якія інвесціруюць у Кітай, страцілі $650 млн. Адток сродкаў фіксуюць і індыйскія фонды. У той жа час, нягледзячы на санкцыі, аб'ём замежных інвестыцый у расійскія фонды склаў па другім паўгоддзі 2016-га каля $200 млн у тыдзень. А колькі замежных інвестыцый прыйшло ў Беларусь? За 9 месяцаў мінулага года — каля $1 млрд. Ці можна ў гэтай сітуацыі, калі ў нас крэдытныя рэсурсы вельмі дарагія, калі бюджэтных сродкаў і прыбытку прадпрыемстваў недастаткова, забяспечыць прыстойную мадэрнізацыю для таго, каб наша прадукцыя была канкурэнтаздольнай? Вядома, не. Таму мы вельмі зацікаўлены ў прыцягненні прамых замежных інвестыцый.

Вядома, лепш, калі айчыннага капіталу будзе больш, але трэба зыходзіць з жорсткага прагматызму, што гэта прадпрыемства працуе на нашай тэрыторыі, з'яўляецца рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, плаціць падаткі ў бюджэт, там працуюць нашы людзі. На беларуска-польскім прадпрыемстве («Бел-Пласт Інтэрнэшнл». — **Аўт**.) за 17 гадоў польскі заснавальнік ні аднаго долара яшчэ адсюль не вывеў. Усе дывідэнды ён рэінвеструе ў развіццё вытворчасці. Таму трэба досыць сур'ёзна гэтым займацца і ствараць умовы для інвестараў».



**Пасля наведвання пяці прадпрыемстваў настрой удзельнікаў быў узняты.**

ВЫНІКІ ГОДА

# ШМАТ НЕ БЫВАЕ

**начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Лідскім раёне Віктар СЫЧЭЎНІК.** Больш як палова грошай у бюджэт паступае ад прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці і індывідуальных прадпрымальнікаў. У раёне працуюць каля 4 тысяч ІП.

**Лідзія ТАНАНУШКА, начальнік фінансавага аддзела Лідскага райвыканкама,** расказала пра пілотны праект, які фінансуецца з мінулага года. Ён аб'яднаў 16 гарадскіх школ, адзін ліцэй, дзве гімназіі і восем сельскіх школ. Ідэя ў тым, каб разлічваць заработную плату і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы не па штатным раскладзе, а згодна з колькасцю вучняў. У цэлым на сацыяльную сферу летась было выдзелена 74% расходаў. Дадатковыя грошы былі накіраваны на ахову здароўя. У цэнтральнай раённай бальніцы адрамантавалі малую аперацыйную і набылі машыну хуткай дапамогі.

## Як праводзіць сесію?

Актыўна ідзе работа і са старшынямі сельскіх Саветаў. «Мы іх збіраем досыць часта, — гаворыць Інэса Белуш. — Перыядычна ў нас праходзіць вучоба. Каб павысіць якасць і ўзровень правядзення сесій і выканкамаў, арганізоўваем іх паказальныя пасяджэнні. Рабілі іх і выязнымі. Напрыклад, у Дзітвянскім сельсавеце абмяркоўвалі, як выконваецца Указ аб зносе незаселеных дамоў. У Дварышчанскім — разглядалі пытанне выканання сацыяльных стандартаў. У нас абавязкова на сесіях выканкамаў пярвічнага ўзроўню прысутнічае хтосьці з адказных работнікаў раёна, каб дэпутаты, члены сельвыканкамаў маглі задаць пытанне, якое хвалюе, усебакова разгледзець праблему і прыняць канкрэтнае рашэнне».

## Не ўкладзеш — не атрымаеш

Прыём грамадзян працуе адладжана. Летась шмат зваротаў было звязана з закрыццём смеццеправодаў. «У нас гэты загад выкананы на сто працэнтаў — закрылі ўсе, але пераконвацца і тлумачыць, дзеля чаго гэта зроблена, даводзілася. Яшчэ ў горадзе ў сектары індывідуальнай жылой забудовы патрэбна належным чынам зрабіць дарогі. Трэба новую гарадскую звалку ўладкаваць, пашырыць могілкі з улікам пажаданняў людзей. Па аграпрамысловым комплексе былі звароты супрацоўнікаў, звязаныя з выплатамі зарплаты і дзіцячай дапамогі. У нас ёсць свой футбольны клуб. І нашы балельшчыкі чакаюць ад гульцоў лепшых вынікаў. Знізілася колькасць зваротаў па рабоце транспарту, спажывецкім рынку і сацыяльных пытаннях».

Адзін з кірункаў дзейнасці — работа з аграгарадкамі. Іх у раёне 16.

— У нас, калі пачалася праграма адраджэння вёскі ў 2005 годзе, было 15 цэнтраў гаспадарак. Першы аграгарадок зрабілі ў Мажэйкаве. Прэзідэнцкая праграма своечасова падтрымала вёску. Калі б тады не звярнулі ўвагу, не накіравалі сродкі, там нічога не было б. Дзяржава гарантавала сельскаму жыхару ўвесь набор сацыяльных стандартаў. Іншая справа, што не спрагназавалі развіццё на 15—20 гадоў. Сёння ў нас ёсць тры аграгарадкі, дзе няма школ. Для вёскі школа — гэта будучыня. А калі дзецям трэба ехаць у суседнюю вёску вучыцца, то не факт, што яны вернуцца назад. Ды і маладыя спецыялісты, сем'і з дзецьмі хутчэй абяруць іншае месца жыхарства.

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

# ГОСЦІ НА ЛІДЧЫНЕ

## Удзельнікі выязнога пасяджэння падзяліліся сваімі ўражаннямі



**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Леанід ЦУПРЫК:**

— Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні не статычны. За перыяд пасля яго прыняцця ў 2010 годзе ўжо адбылося каля сямі змяненняў і дапаўненняў, якія якраз і дазваляюць яму ў большай ступені адпавядаць патрабаванням рэальнага жыцця. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, працуючы ў акругах, звязаныя з тымі падзеямі, якія адбываюцца на ўзроўні сельскіх, пасялковых, абласных Саветаў. Таму тыя праблемы, якія сёння выказваюць і самі людзі, улічваюцца ў далейшай рабоце камісій парламента. Мы вельмі цэнім тую актыўнасць, якую праяўляюць нашы выбаршчыкі, і фактычна пасля кожнага прыёму грамадзян, пасля сустрэч з працоўнымі калектывамі заўсёды ўносяцца прапановы ў змяненні тых ці іншых законаў.

Пасля наведвання прадпрыемстваў я магу адзначыць, што чым больш эфектыўна працуе эканоміка тэрыторыі, тым у большай ступені ідзе напаўненне бюджэту. А гэта дае магчымасці вырашаць сацыяльныя праблемы людзей. У ходзе семінара мы наведваем цэлы шэраг эканамічна паспяховых прадпрыемстваў, якія развіваюцца, што самае галоўнае, і дапамагаюць развіццю сацыяльнай сферы тэрыторыі, і ў гэтым удзельнічаюць мясцовыя Саветы. Стварающа неабходныя ўмовы для інвестара — гэта вельмі станоўча.



**Член Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі, першы намеснік старшыні Камітэта па федэратыўным ладзе, дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы Сцяпан КІРЫЧУК:**

— Такое ўзаемадзеянне выканаўчых і прадстаўнічых органаў прыйшлося мне даспадобы. Усе тыя аб'екты, якія мы наведалі, маюць сваю адметнасць, але агульнае ў іх — гэта тое, што вытворчасці тэхналагічныя, новыя, сучасныя. Гэта ўплывае на будучыню Лідскага раёна. Мне спадабалася густанаселенасць раёна. Незалежна ад таго, што шмат снегу, усё пачышчана. Гэта вельмі выдатна. Уражвае вытворчасць, больш за ўсё — перспектыва аграпрамысловага комплексу па вырабе мяса індычкі. Падабаецца, што тыя прадпрыемствы, на якіх мы былі, маюць досыць вялікі працэнт экспарту. Прычым некаторыя лічаць, што іх паказчык нізкі, але не кожнае прадпрыемства можа пахваліцца такім узроўнем, а калектывы ставяць перад сабой яшчэ больш высокія задачы. Падабаецца, як Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч і яго калегі ставяць пытанне аб павышэнні заработнай платы, аб выкананні даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пра тое, каб яна была павышана да пэўнага часу.

Няма ў Беларусі тых месцаў і людзей, якія б мне не падабаліся. Гэта мая любоў, мая маладосць, і я сюды вяртаюся з велізарным пачуццём падзякі.



**Намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандр МІКША:**

— Прадпрыемствы, якія мы наведалі, у асноўным прыватныя, і, паколькі яны нядаўна ўтварыліся, у іх няма першасных прафсаюзных арганізацый. Таму наша задача сёння, каб на ўсіх гэтых прадпрыемствах былі прафсаюзныя арганізацыі. Такое даручэнне зрабіў на VI з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі лідар нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Мы зробім усё магчымае, каб такія «пярвічкі» былі. Вопыт падказвае: калі ёсць прафсаюзная арганізацыя, нармальныя адносіны паміж ёй і кіраўніком прадпрыемства, то прадукцыйнасць працы толькі павялічваецца.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*